## НАВІНЫ. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ

# СА СВЯТАМ!

Святочны канцэрт, прысвечаны адразу дзвюм датам – Дню настаўніка і Дню пажылога чалавека, прайшоў у нашым універсітэце напрыканцы верасня. На мерапрыемства былі запрошаны супрацоўнікі і выкладчыкі ВНУ, ветэраны педагагічнай працы. Прысутных павіншаваў намеснік старшыні ўпраўлення адукацыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта С.У. Арэхаў, які расказаў пра вынікі рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года» і адзначыў, што сярод пераможцаў – выпускнікі ВДУ імя П.М. Машэрава, у тым ліку і ўладальніца ганаровага звання «Настаўнік года – 2017», настаўніца беларускай мовы і літаратуры С.Л. Румянцава.

Затым Сяргей Уладзіміравіч уручыў ганаровыя граматы ўпраўлення адукацыі выкладчыкам нашай ВНУ. А перад тым як уручыць ганаровыя граматы ўніверсітэта, колькі добрых слоў у адрас прысутных сказала прарэктар нашай альма-матар В.В. Багатырова. Пасля афіцыйнай часткі перад гледачамі выступілі творчыя калектывы ўніверсітэта і горада.